НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ
Институт истории

# ПРОБЛЕМЫ МЕТОДОЛОГИИ ИССЛЕДОВАНИЙ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ

Материалы Международной научной конференции (Минск, 26–27 октября 2006 года)

Минск
«Белорусская наука»
2008

**М. В. Цуба**

*Палескі дзяржаўны універсітэт (Пінск)*

# КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І РУХАЎ У БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (ЖНІВЕНЬ 1914 — ЛЮТЫ 1917 г.)

У сённяшні час значна ўзрасла цікавасць да паглыбленага вывучэння найбольш складаных малараспрацаваных перыядаў у гістарычным развіцці Беларусі, з'явіліся працы, у аснове якіх было выкарыстана шырокае кола архіўных крыніц, звароты да навуковых гістарычных работ дарэвалюцыйных даследчыкаў, да даследаванняў замежных гісторыкаў. Усё гэта дазволіла з новых пазіцый падысці да асвятлення шматлікіх пытанняў грамадска-палітычный праблематыкі часоў Першай сусветнай вайны. Але найбольшая складанасць заключаецца якраз у тым, каб гэтыя «новыя» падыходы даследавання не перакрэслілі нічога станоўчага, дасягнутага гісторыкамі савецкага перыяду, і ў той жа час адпавядалі сучасным патрабаванням, адлюстроўваючы сапраўдную гісторыю аб'екта даследавання.

Аднак, нягледзячы на з'яўленне прыкметных, значных даследаванняў па тэматыцы Першай сусветнай вайны беларускіх, расійскіх і польскіх гісторыкаў, усё ж неабходна адзначыць, што перыяд (жнівень 1914 — люты 1917 гг.) у гісторыі грамадска-палітычных рухаў з'яўляецца найменш распрацаваным і высветленым. Гэта можна растлумачыць шэрагам акалічнасцей.

Па-першае, па агульна прынятых меркаваннях лічылася, што дзейнасць палітычных партый на Беларусі была фактычна прыпынена пасля паражэння Першай расійскай рэвалюцыі (1905—1907 гг.) і амаль канчаткова ліквідавана з пачаткам Першай сусветнай вайны. Па-другое, часта прадузятыя адносіны да ўсяго таго, што адбывалася да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., вялі да непапулярнасці разгляду падзей Першай сусветнай вайны і перашкаджалі грунтоўнаму вывучэнню тэматыкі грамадска-палітычнага жыцця гэтага часу. Па-трэцяе, Другая сусветная вайна, якая пачалася ў 1939 г., ва ўсіх адносінах пераўзышла па сваіх маштабах Першую сусветную вайну, у сувязі з чым многія гісторыкі былі задзейнічаны на яе вывучэнне.

Вялікае значэнне для распрацоўкі тэматыкі Першай сусветнай вайны маюць шматлікія выданні перыядычнага друку часоў далютаўскай рэвалюцыі. Галоўную ўвагу тут патрэбна звярнуць на беларускія нацыянальныя выданні. Найбольш важнай гістарычнай крыніцай з'яўляецца непасрэдна газета «Наша ніва». У артыкулах, што змяшчаліся на яе старонках, гучалі патрабаванні грамадзянскага, нацыянальнага раўнапраўя беларусаў за прызнанне беларускай нацыі, мовы і культуры, вялася барацьба супраць нацыянальнага прыгнёту, супраць вялікарускіх шавіністаў і польскіх нацыяналістаў. Хаця «Наша ніва» ўвогуле займала антываенную пазіцыю, усё ж на яе старонках мелі месца пэўныя спадзяванні змен грамадска-палітычнага характару, звязаныя з вайной. Акрамя таго, шырока адлюстроўваліся ўплывы вайны на грамадскасць краю.

Пытанні, звязаныя з нацыянальнымі патрэбамі беларусаў напачатку вайны, а таксама з дабрачыннай працай беларускіх адраджэнцаў у ваенны час, паднімала на сваіх старонках газета «Беларус». Гэта выданне, разлічанае пераважна на католікаў-беларусаў, знаёміла чытачоў з некаторымі культурна-асветніцкімі і грамадскімі падзеямі і фактамі, якія мелі месца ў гісторыі нашага народа.

Уся разнастайнасць грамадска-палітычных і культурных перамен падчас Першай сусветнай вайны знаходзіла сваё адлюстраванне ў беларускай газеце «Гоман». Выступаючы за нацыянальнае адзінства беларусаў, газета прапагандавала нацыянальную самасвядомасць як падставу для духоўнай кансалідацыі ўсяго беларускага народа. Акрамя таго, істотную інфармацыю, звязаную з нацыянальнай працай сярод бежанцаў-беларусаў, утрымліваюць беларускія газеты, выдадзеныя ў 1916 г. у Петраградзе — «Дзянніца» і «Светач», якія разглядалі культурныя і навуковыя праблемы беларускага адраджэння, стаўленне яго да вайны і інш.

З афіцыйных газет гэтага перыяду, выдадзеных на Беларусі, хацелася б адзначыць «Вестник Комитета Западного фронта». У сваіх артыкулах газета паднімала самыя розныя пытанні, што тычыліся грамадскага жыцця на беларускіх губернях падчас вайны: падрабязна інфармавала аб дзейнасці земскіх устаноў на Заходнім фронце, бежанскіх скітаннях, асвятляла ход ваенных дзеянняў, утрымлівала шмат каштоўнага статыстычнага матэрыялу.

У газеце «Виленский вестник» найбольшы інтарэс, у адпаведнасці з тэматыкай нашага даследавання, прыцягваюць артыкулы культурна-асветніцкага кірунку і абавязковыя пастановы камандавання расійскага фронту на мясцовасцях, што знаходзіліся на ваенным становішчы.

Асобныя пытанні, звязаныя з грамадска-палітычным жыццём у гады вайны, таксама асвятляліся на старонках такога польскага выдання, як «Kurier Litewski».

Тыя або іншыя праявы грамадска-палітычнага жыцця на Беларусі закранаюцца і ў іншых газетах таго часу («Могилевский вестник», «Северо-западная жизнь», «Витебские ведомости», «Оршанский вестник» і інш.), але галоўнае ў іх публікацыях — гэта адлюстраванне мясцовай рэчаіснасці. Што ж датычыць асвятлення агульных пытанняў грамадска-палітычнага зместу, то матэрыялы такога характару ў асноўным перадрукоўваліся з афіцыйных сталічных газет.

Акрамя таго, пачынаючы з восені 1915 г. на акупіраванай тэрыторыі Беларусі з'явілася істотная колькасць газет, разлічаных як на мясцовае насельніцтва, так і на нямецкага чытача. Да іх ліку адносяцца «Zeitung der 10 Armee» («Газета 10 арміі»), «Vilnaer Zeitung» («Віленская газета»), «Kriegszeitung von Baranowitschi» («Вайсковая газета ў Баранавічах»), «Grodnaer Zeitung» («Гродзенская газета») і інш. Асобныя выданні гэтых газет спалучалі друкаванне матэрыялаў на нямецкай, беларускай, польскай, яўрэйскай мовах. Тут падніmaліся пытанні аб нацыянальным самавызначэнні беларускага краю, аб паходжанні народаў, якія насяляюць Беларусь, іх гісторыі, мове, культуры. Аднак нельга забываць і на тое, што кайзераўскімі ўладамі ў дачыненні да мясцовых жыхароў на акупіраваных тэрыторыях ставілася задача: разгарнуць шырокую прапаганду з мэтай паслабіць уплывы царскай Расіі і стварыць альтэрнатыву той нацыянальнай палітыцы, якую праводзіла дагэтуль на беларускіх землях самадзяржаўе.

Публікацыя крыніц па праблемах грамадска-палітычнай тэматыкі ў гады Першай сусветнай вайны ў першапачатковы перыяд пераважна належала ўспамінам і мемуарам непасрэдных удзельнікаў тых падзей. Аднымі з першых не толькі навуковых, але і дакументальных крыніц аб складаных і супярэчлівых працэсах грамадска-палітычнага жыцця і дзейнасці беларускага нацыянальнага руху падчас вайны былі працы Ю. Вітан-Дубейкаўскай [1], Я. Канчара [2], Ф. Турука [3]. У іх у якасці дадатку быў змешчаны разнастайны дакументальны матэрыял, які не страціў сваёй навуковай вартасці і ў нашы дні.

Камісіі па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі і партыі ў Віцебску і Гомелі, Гістпарт пры ЦК КП(б)Б падрыхтавалі і выдалі першыя зборнікі артыкулаў, мемуараў і дакументальных матэрыялаў аб рэвалюцыйных падзеях у Беларусі. (Революционная борьба в Гомельской губернии: Ист. Материалы. Гомель, 1921, вып. I; Красная быль: Большевики в Витебске. Сб. ст., воспоминаний и материалов. Витебск, 1923; Кастрычнік на Беларусі: Зб. Арт. і дак. Мінск, 1927, вып. I).

Цікавую і карысную інфармацыю для вывучэння грамадска-палітычнай праблематыкі ў нашым краі маюць некаторыя справаздачныя зборнікі разглядаемага перыяду. Дадзеныя зборнікі пераважна ўтрымліваюць загады і распараджэнні ўрадавых структур, а таксама асвятляюць ход выканання тых альбо іншых мерапрыемстваў адносна беларускіх губерняў. Сярод іх неабходна выдзяліць справаздачныя выданні: «Эвакуацыйная камісія пры Мінскім Губернскім Аб'яднаным Земска-Гарадскім Ваенна-Прамысловым Камітэце» [4] і «Кароткая справаздача аб дзейнасці Мінскага Губернскага Камітэта У. З. С. за 1916 г.» [5]. У гэтых выданнях на канкрэтным матэрыяле праглядаецца не толькі эвакуацыйная праца і дзейнасць органаў самакіравання падчас Першай сусветнай вайны, але і ўся сапраўдная глыбіня грамадска-сацыяльных змен у жыцці Беларусі ў дадзены перыяд.

Пачынаючы з першых пасляваенных гадоў усё большае значэнне набываюць зборнікі статыстыкі, даведачныя выданні, стэнаграмы, пратаколы і іншыя матэрыялы ваенных, дзяржаўных і грамадскіх устаноў. Менавіта ў савецкі час на аснове сабраных звестак апублікаваны шэраг зборнікаў матэрыялаў і дакументаў, прысвечаных зменам грамадска-палітычных адносін на Беларусі ў сувязі з ваеннымі падзеямі часоў Першай сусветнай вайны: «Крах немецкой оккупации в Белоруссии в 1918 году» (Минск, 1947); «Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917)» (Т. 3. Минск, 1953); «Документы и материалы по истории Белоруссии» (Т. 4. Минск, 1954); «В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте. Воспоминания активных участников Октябрьской революции» (Минск, 1957); «Революционное движение в Белоруссии (июнь 1907 — февраль 1917)» (Минск, 1987). Найбольш карысным для нашага даследавання ў дадзеных выданнях з'яўляецца дакументальнае адлюстраванне самых розных падзей, фактаў і лічбаў у даследуемы перыяд.

Значны ўклад у распрацоўку азначанай праблемы быў унесены сумесным беларуска-расійскім даследаваннем «Октябрь 1917 г. и судьбы политической оппозиции» (Ч. 1—3) [6], у якім на падставе новых архіўных крыніц разглядаюцца пытанні грамадска-палітычнага жыцця ў пачатку XX ст., у тым ліку і ў 1914—1917 гг. Малавядомым старонкам гэтага перыяду беларускай гісторыі шмат у чым даецца новае тлумачэнне, паказваецца складанасць і драматызм тысяч лёсаў беларусаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў беларускага краю, якія, нягледзячы на цяжар вайны, праводзілі грамадска-палітычную дзейнасць, наколькі гэта дазвалялі абставіны. Але асабліва каштоўным з'яўляецца тое, што з вялікай паўнатой тут знаходзяць месца грамадска-палітычныя пытанні, якія раней у сілу пэўных абставін не атрымалі патрэбнага асвятлення. У гэта выданне ўключаны загады, граматы, законы, матэрыялы перыядычнага друку, успаміны і іншыя гістарычныя крыніцы, многія з якіх раней не былі вядомы шырокаму колу чытачоў.

Важным набыткам крыніцазнаўчай гістарыяграфіі Беларусі з'явіўся выхад у свет зборніка гісторыка-дакументальных матэрыялаў: «История Беларуси в документах и материалах» [7]. Матэрыялы зборніка ахопліваюць увесь перыяд беларускай гісторыі, пэўнае месца тут адводзіцца і дакументам 1914—1917 гг., некаторыя з іх з'яўляюцца бібліяграфічнай рэдкасцю і друкуюцца на мове арыгінала.

Значнае пашырэнне дакументальнай базы ведаў аб грамадска-палітычным жыцці ў час Першай сусветнай вайны належыць публікацыям у «Беларускім гістарычным часопісе», «Гісторыі: праблемы выкладання», «Беларускай думцы». Хаця пададзеныя ў гэтых часопісах дакументальныя факты і звесткі аб тых ці іншых партыйных арганізацыях, асобных лідэрах даволі вузка асвятляюць працэсы грамадска-палітычнага руху і не даюць поўнага ўяўлення пра размах і выніковасць, пра рэальнае месца грамадска-палітычных сіл і велічыню іх уздзеяння, уплыву на падзеі Першай сусветнай вайны, усё ж патрэбна адзначыць, што, дзякуючы гэтым артыкулам, у навуковы абарот уводзіцца шмат малавядомых і невядомых архіўных матэрыялаў, пачынаецца пранікненне ў сутнасць падзей таго часу, адбываецца аб'ектыўнае пераасэнсаванне мінулага.

Важнай крыніцай узбагачэння ведаў па вывучэнні грамадска-палітычнай і культурна-асветніцкай дзейнасці беларускага адраджэнскага руху ў даследуемы перыяд з'яўляюцца некаторыя энцыклапедычныя выданні: «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» ў шасці тамах, т. 1, 2 [8], «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» ў пяці тамах [9], а таксама аднатомная энцыклапедыя «Беларускай мовы» [10]. Створаныя вялікімі калектывамі навукоўцаў Беларусі, яны утрымліваюць разнастайныя гістарычныя матэрыялы, шматлікія звесткі аб выдатных прадстаўніках беларускага народа, якія праявілі сябе ў розных галінах жыццядзейнасці грамадства, багатую культурна-асветніцкую інфармацыю.

Дакументальны матэрыял выдадзеных зборнікаў і энцыклапедый дапамагае ў пэўнай ступені высветліць розныя напрамкі грамадска-палітычнага жыцця на Беларусі падчас Першай сусветнай вайны і з'яўляецца своеасаблівым даведнікам па вывучэнню шматлікіх літаратурных крыніц. Але, нягледзячы на значную ролю, якую адыгрываюць вышэй прыведзеныя выданні, усё ж патрэбна адзначыць, што ў многіх з іх апублікаваныя матэрыялы выразаны з агульнага асяроддзя іншых дакументаў, якія вяліся па той ці іншай справе (а ў кожнага з іх была свая праўда) і не заўсёды адпавядаюць аб'ектыўнаму адлюстраванню. Акрамя таго, у савецкі перыяд заахвочваўся і прапагандаваўся падбор асобных дакументальных крыніц, якія падкрэслівалі абсурднасць тых ці іншых учынкаў самадзяржаўных улад, у той жа час апускаючы іншыя, больш важныя моманты. Таксама практыкаваліся наўмысныя скарачэнні, выкарыстанне ўрыўкаў з тэксту з аўтарскім тлумачэннем і г. д., усё гэта зачастую прыводзіла да скажэння сэнсу некаторых дакументаў. Таму ўсе гэтыя абставіны патрабуюць неабходнасці праверкі і дапаўнення дадзенага віда крыніц іншымі дакументамі.

У гэтых адносінах вялікае значэнне маюць непасрэдна архіўныя матэрыялы, якія ў параўнанні з выдадзенымі дакументальнымі зборнікамі болей дакладныя і правільныя, таму што яны захавалі не толькі копіі розных справаздач з месц, але і першасныя дадзеныя, на аснове якіх гэтыя справаздачы складаліся.

Асаблівую важнасць для нашага даследавання прадстаўляюць фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Тут асобныя справы ўтрымліваюць даволі разнастайны і цікавы матэрыял па тэматыцы грамадска-палітычнага жыцця на Беларусі падчас даследуемага перыяду. Асноўная частка архіўных дакументаў, якія датычацца грамадска-палітычнага становішча і рэвалюцыйнага руху на Беларусі ў гады разглядаемай вайны, сканцэнтравана пераважна ў фондах дэпартамента паліцыі, жандарскіх і паліцэйскіх упраўленняў, фабрычных інспектараў, прадвадзіцеляў дваранства і інш. Некаторыя фонды ўтрымліваюць шырокае кола даследуемых пытанняў. Напрыклад, фонд 295 змяшчае даныя аб культурна-асветных мерапрыемствах, звесткі аб удзельніках рэвалюцыйных выступленняў і стаячых пад наглядам паліцыі і г. д.

Дакументы, якія датычацца судовых спраў заведзеных падчас вайны на прадстаўнікоў розных рэвалюцыйных плыняў знаходзяцца ў матэрыялах фонду 705. Асаблівую значнасць прадстаўляюць тут загады дэпартамента паліцыі аб барацьбе з рэвалюцыйнымі выступленнямі (воп. 1, спр. 15), а таксама абавязковыя пастановы ваеннага камандавання, выдадзеныя на тэрыторыі беларускіх губерняў, што знаходзіліся на ваенным становішчы (воп. 1, спр. 27).

Пэўны дакументальны матэрыял аб рэвалюцыйнай агітацыі, распаўсюджванні антыўрадавых лістовак, рэвалюцыйнай дзейнасці некаторых палітычных партый на Беларусі ў гэты перыяд утрымліваюць фонды 2499 і 60.

Асобныя справы фонду 1416 запоўнены матэрыяламі аб найвышэйшых загадах Мікалая II і Міністэрства Унутраных Спраў Расійскай Імперыі (воп. 1, спр. 2350), аб эвакуацыі і стварэнні рэквізіцыйных камісій на Беларусі з выпадку нямецкага наступлення (воп. 1, спр. 2407).

Пошук матэрыялаў у НАРБ ускладняецца тым, што асобныя звесткі аб беларускім нацыянальным руху, іншых нацыянальных рухах і іх партыйных арганізацыях змяшчаюцца ў шматлікіх справах розных фондаў разам з іншымі матэрыяламі, якія не маюць ніякага дачынення да гэтай тэматыкі.

Паказальным з лепшага боку ў гэтым плане з'яўляецца Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва ў г. Мінску (БДАМЛІМ), дзе ў фондзе № 3 «Дакументы беларускіх нацыянальных палітычных і культурна-асветніцкіх арганізацый» сабраны і сістэматызаваны матэрыялы па тэматыцы беларускага нацыянальнага руху. Тут прадстаўлена калекцыя дакументаў, якая распавядае аб працы бела-

рускіх адраджэнцаў у гады пасля першай расійскай рэвалюцыі, падчас новага рэвалюцыйнага ўздыму, а таксама ёсць цікавыя звесткі аб іх дзейнасці ў перыяд Першай сусветнай вайны. Па сваім складзе гэта творчыя і бібліяграфічныя дакументы, перапіска беларускіх адраджэнцаў, загады, пратаколы, рэзалюцыі, а таксама асабістыя дакументы беларускіх дзеячаў, рэдакцый часопісаў і газет, розных саюзаў, камітэтаў і таварыстваў.

Найбольшую каштоўнасць для нашага даследавання прадстаўляюць дакументы беларускіх нацыянальных культурна-асветніцкіх арганізацый (воп. 1, спр. 1—32) матэрыялы беларускіх нацыянальных выдавецтваў, часопісаў і газет (воп. 1, спр. 33—123), дакументы беларускіх дзеячаў (воп. 1, спр. 217—229). Акрамя таго, пэўныя звесткі аб вядомых беларускіх дзеячах, а таксама па стварэнню некаторых беларускіх арганізацый аўтар знайшоў у фондзе № 3 (воп. 2, спр. 4, 8).

Комплекс дакументаў, дзе разглядаюцца сацыяльныя, палітычныя і культурна-асветніцкія аспекты грамадска-палітычнага жыцця, загады ваенных улад, успаміны палітычных дзеячаў, звязаныя з «краёвай» ідэяй у беларускай грамадска-палітычнай думцы ў першай чвэрці XX ст., утрымліваюцца ў Беларускім дзяржаўным гістарычным архіве ў Гродна, Брэсце, Гомелі.

Багаты матэрыял па даследуемай намі тэматыцы, асабліва што датычыць заходніх рэгіёнаў Беларусі, утрымліваецца ў фондах Рэспублікі Польшча, перш за ўсё ў Архіве Новых Актаў у Варшаве. Каштоўныя архіўныя дакументы, якія характарызуюць дзейнасць польскага нацыянальнага руху, дабрачынных і выратавальных арганізацый на беларускіх землях падчас вайны, ёсць у фондах 11, 26, 105, 284, 722 гэтага архіва. Акрамя таго, у азначаных фондах знаходзіцца значная колькасць дакументальных звестак, мемуарных успамінаў, якія асвятляюць уласнае бачанне грамадска-палітычных праблем на беларускіх землях, этнатэрытарыяльныя, культурна-моўныя, канфесійныя аспекты ўзаемаадносін палякаў з іншымі нацыянальнасцямі ў гады вайны на Беларусі.

Бясспрэчную навуковую навізну для нашага даследавання прадстаўляе ў Архіве Новых Актаў калекцыя дакументаў нямецкага Міністэрства ўсходніх абшараў — так званых «Александрыйскіх мікрафільмаў». Хаця галоўная ўвага ў гэтых дакументах надаецца Другой сусветнай вайне, усё ж шмат матэрыялаў адлюстроўвае дзейнасць нямецкіх акупацыйных улад на захопленай тэрыторыі Беларусі ў 1915—1917 гг., дзе значнае месца ўдзяляецца палітыцы Германіі ў дачыненні да акупіраваных беларускіх тэрыторый, а таксама адносінам кайзераўскіх улад да розных грамадска-палітычных сіл і нацыянальнасцей у нашым краі.

Увядзенне ў навуковы абарот шырокага кола архіўных дакументаў дазваляе наблізіцца да аб'ектыўнага аналізу стану і асаблівасцей развіцця грамадска-палітычных адносін на беларускіх землях падчас Першай сусветнай вайны. Разам з тым неабходна адзначыць, што пошук архіўных матэрыялаў звязаны з пэўнымі цяжкасцямі. Аб няпоўнасці і незахаванасці архіўных матэрыялаў гавораць тыя факты, што за першы перыяд вайны (жнівень 1914 — лета 1915 гг.) амаль поўнасцю адсутнічаюць дакументы, якія б адлюстроўвалі палітычны змест дзейнасці беларускага адраджэнскага руху. Недастаткова прадстаўлены гэты аспект, а таксама работа па стварэнню беларускай дзяржаўнасці і ў дакументах, якія расказваюць аб працы беларускіх грамадска-палітычных арганізацый пад нямецкай акупацыяй, хаця з успамінаў сучаснікаў вядома, што праца ў гэтым кірунку тут прыняла даволі шырокі размах. Далёка не поўна высветлена ў архіўных матэрыялах і дакументах перш за ўсё праблематыка палітычнай дзейнасці агульнарасійскіх, яўрэйскіх партыйных арганізацый і груповак у першыя гады вайны на Беларусі. У сувязі з такім становішчам спраў па даследаваннях вышэй адзначанай тэматыкі можна працягваць далейшы пошук новых архіўных даных, у тым ліку і за межамі Рэспублікі Беларусь.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Вітан-Дубейкаўская Ю.* Мае ўспаміны — V.: Gudu Kulturos Draugija Lietuvoje, 1994.
2. *Канчер Е. С.* Белорусский вопрос. — Петроград: Изд-во Бел. отд. Комиссариата по делам Нац. С. К. С. О., 1919.
3. *Турук Ф.* Белорусское движение. Очерк национального и революционного движения белорусов. — М.: Госиздат, 1921.
4. Эвакуационная комиссия при Минском Губернском Объединенном Земско-Городском Военно-Промышленном Комитете. — Минск, 1915.
5. Краткий отчет о деятельности Минского Губернского Комитета В. З. С. за 1916 г. — Минск: Тип. Б. Л. Каплана, 1917.
6. Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Совместное российско-белорусское исследование. В 3 ч.: Материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь / Н. С. Сташкевич, Г. Г. Касаров, Р. В. Платонов [и др.]; Под ред. Э. М. Энтина. — Гомель: Белорусское Агентство научно-технической и деловой информации, 1993.
7. История Беларуси в документах и материалах / Авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец — Минск: Амалфея, 2000.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мінск: БелЭн, 1993—2003.
9. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мінск: БелСЭ, 1984—1987.
10. Энцыклапедыя беларускай мовы / Пад рэд. А. Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БелЭн, 1994.